# Піянерская паляна

выпуск 5

КРАСАВІК - МАЙ

2021



## Дзень піянерскай дружбы







Дзень піянерскай дружбы - свята, заснаванае ў гонар піянерскага руху.

19 мая ва ўстанове прайшла ўрачыстая лінейка, прысвечаная гэтаму святу.

Дзейнасць БРПА распаўсюджваецца на ўсю тэрыторыю Рэспублікі Беларусь. Гэта арганізацыя, дзе дзеці нараўне з дарослымі плануюць, праводзяць і падводзяць вынікі цікавых і карысных спраў.

Старшыня піянерскай дружыны імя Колі Гойшыка Нагорная Марыя павіншавала ўсіх са святам і зачытала біяграфію нашага дружыннага героя Колі Гойшыка, які таксама быў піянерам і нароўні з дарослымі абараняў сваю Радзіму ад гітлераўскіх захопнікаў.

На ўрачыстай лінейцы абдыўся прыём у піянеры рабят 4-5 класаў. Пасля таго, як яны далі ўрачыстае абяцанне, ім павязалі піянерскія гальштукі.

Ганаровае права павязаць піянерскія гальштукі атрымалі лепшыя піянеры нашай школы Нагорная Марыя і Русакевіч Ксенія.

Менавіта ў Дзень піянерскай дружбы 9 навучэнцаў нашай школы сталі членамі вялікай і дружнай піянерскай сям'і.

*Папека Настасся, член БРСМ*

# "Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі"

2 красавіка адзначаецца Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі
У гэты дзень з вучнямі былі праведзены выхаваўчыя мерапрыемствы. З навучэнцамі 5-7 класаў была праведзена гутарка "Дзве сястры-Беларусь і Расія".
Вучні 9 класа прынялі ўдзел у акцыі "Мы адзіныя", падчас якой распаўсюджвалі лістоўкі сярод педагогаў установы.
Удзельнікі аздараўленчага лагера наведалі сельскую бібліятэку, дзе з імі было праведзена выхаваўчае мерапрыемства "Дзве краіны - адзін лёс", прысвечанае Дню яднання дзвюх краін.

***Еўтуховіч Маргарыта, піянер дружыны імя Колі Гойшыка***





# "Аднаўленне святынь Беларусі"

Валанцёры нашай школы прынялі ўдзел у дабрачыннай акцыі "Аднаўленне святынь Беларусі", якая прайшла на тэрыторыі Ізбійскага бору і была накіравана на добраўпарадкаванне тэрыторыі. Удзельнікі акцыі прыбралі сухія галінкі, леташнюю траву. Падчас работы рабяты зрабілі фота на памяць.

***Студзент Ульяна,***
***піянер дружыны імя Колі Гойшыка***







# Вялікі піянерскі збор "Мы - грамадзяне сваёй краіны"

22 мая у Ганцавіцкім раённым цэнтры дзіцячай і юнацкай творчасці прайшоў раённы піянерскі збор “Мы - грамадзяне сваёй краіны”, прысвечаны “Дню піянерскай дружбы”.
Дзень пачаўся з урачыстай лінейкі, падчас якой самыя актыўныя акцябраты ўступілі ў вялікую і дружную піянерскую сям'ю.
Нашы піянеры прынялі актыўны ўдзел у спаборніцтвах раённага этапу рэспубліканскага праекта “Алімпіяда дваровых гульняў”: гулялі ў “Выбівайла” і “Разрыванне ланцуга” з камандамі Хатыніцкай сярэдняй школы і Круговіцкага ясляў-сада - сярэдняй школы, скакалі ў "Класікі" і "Разіначкі".
Весела і карысна прайшло свята піянерскай дружбы, дзеці павезлі з сабой масу пазітыву і незабыўныя яркія ўражанні.

***Еўтуховіч Маргарыта,***
***піянер дружыны імя Колі Гойшыка***







Ганцавіцкі раён
в.Дзяніскавічы
вул. Леніна 93а
Тэлефон: 8 0164651138
Сайт: https://deniskovichi.schools.by
E-mail: deniskovichi@gancevichi.edu.by

«Піянерская паляна»
Тыраж 4 экзэмпляры
Выданне надрукавана
на прынтэры фармата А4

2021 год

Галоўны рэдактар: Лаўрэнцьева І.П.
Рэдактар: Гардзей Г.М.
Аўтары: школьны прэс-цэнтр
Рэцэнзент: Берташ Н.І.

ДУА «Дзяніскавіцкі
яслі-сад—сярэдняя школа»